**УДК 94(476)**

# ПАТЭНЦЫЯЛ ПАМЕЖНАЙ СЛУЖБЫ Ў МІРНЫ І ВАЕННЫ ЧАС НА ПРЫКЛАДЗЕ БАТАЛЬЁНА “БУДСЛАЎ” КОРПУСА АХОВЫ ПАМЕЖЖА

***Ю. І. ЗГІРСКІ***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. А. В. СУМКО)***

*На падставе аналізу гістарыяграфіі, архіўных матэрыялаў і матэрыялаў вуснай гісторыі, аўтарам зроблены высновы аб магчымасцях і патэнцыяле Корпуса аховы памежжа як памежнай службы. Аўтарам разглядаецца перыяд з другой паловы 1920-х па 1939 гады.*

Пры разгляданні тэмы спецыяльных фармаванняў трэба ўдакладніць, што апошнія адрозніваюцца ад асноўных вайсковых фармаванняў спецыфікай мэт, іх ажыццяўлення і структурай. Памежная служба, як спецыяльнае фармаванне, мае сваю спецыфіку ажыццяўлення сваіх мэт і задач. Асноўная мэта памежнай службы – ахова мяжы. Рэалізацыя мэты можа з’яўляцца паспяховай у залежнасці ад шматлікіх фактараў, якія ўплываюць на задачы (заўв. у тым ліку і іх пастаноўку) і мэту спецыяльнага фармавання.

Як было агучана вышэй, асноўнай задачай памежнай службы з’яўляецца ахова мяжы, у тым ліку, і абарона пад час наступу ці правакацыі. Вылучаюцца две задачы пры рашэнні мэты з папраўкай на ўзброенную ахову мяжы: абарона мяжы ў выніку ажыццяўлення нападу на мяжу (1) і ахова мяжы ў мірны час (2).

1) Пры разглядзе гэтай задачы памежнай службы неабходна прыняць ва ўвагу наступны факт: памежная служба не здольная абараняць мяжу пад час шыракамаштабнага наступу ўзброенных сіл.

Яскравым прыкладам з’яўляюцца падзеі 1939 г. Адной з прычын, з’яўляецца спецыфіка дыслакацыі нізавых фармаванняў, а менавіта роскід баявых адзінак уздоўж усёй мяжы. Наяўнасць рэзэрву для адбіцця атакі не вырашала гэту задачу пры наступе ўзброенных сіл праціўніка [6]. Апошняе яскрава фіксуецца ў краязнаўчых матэрыялах з гісторыі Докшыц, ўзяцце якімі адбылося кавалерыйскімі (з в. Волберавічы) і танкавымі (праз в. Восава) адзінкамі: “*Толькі вечарам хтосьці паведаміў, што да савецка-польскай мяжы падыходзяць танкі і аўтамашыны. Раніцай 17 верасня, у нядзелю, з боку Свістаполля ў горад прыскакаў савецкі кавалерыст, які распытаў гараджанаў аб наяўнасці ў горадзе саладатаў і радыёвузла і г.д. Потым развянуўся і паскакаў назад у лес. Тады з лесу з’явіліся кавалерысты, а праз нейкі час у горад увайшлі танкі… Пагранічнікі, якіх на стражніцах засталося мала, не здолелі аказаць аніякага значнага супраціўлення. Яны ўсё ж стралялі, але ж немагчыма вінтоўкамі спыніць танкі. Докшыцы былі захопленыя без ніводнага выстрала. Тут былі толькі 7 салдатаў КОП у казармах і 4-5 рэзервістаў. Іх адразу ж узялі ў палон.*” [3].

2) Выключэннем з’яўляецца абарона пры правакацыі праціўнікам ці прарыў мяжы малымі ўзброеннымі групамі (заўв. дыверсанты), на якія сіл асобных стражніц, а ў пры прарыве абароны стражніц сіл рэзэрва, было дастаткова для ліквідацыі ўзброеннай групы ці ўзмацнення стражніцы пад час боесутыкнення, чаму спрыяла падтрымка рэзэрва, падтрыхтоўка і ўзбраенне нізавых адзінак Корпуса аховы памежжа. Не апошнюю ролю адыграла падртымка ці паляпшэшше КАПам і яго папярэднікамі памежнай інфараструктуры, што спрыяла мабільнасці ўздоўж усёй мяжы [9].

З усяго вышэйнапісанага вынікае, што сіл памежнай службы не дастаткова для раўназначнага адказу супраціўніку ў выніку шыракамаштабнага націску, але дастаткова для барацьбы з дыверсійнымі групамі і правакацыямі. Тут трэба ўдакладніць, што Корпус аховы памежжа – спецыялізаваная памежная служба. Яе структура і мэты адрозніваюцца ад мэт і задач Стражы Гранічнай (заўв. польская памежная служба, якая займалася аховай меж з Германіяй, Чэхаславакіяй і Румыніяй). Унікальны вопыт дзейнасці Корпуса аховы памежжа дазваляе раскрыць патэнцыял і магчымасці памежнай службы, у тым ліку і ў наш час. З гэтай мэтай, неабходна прааналізаваць мэты і задачы Корпуса аховы памежжа (заўв. далей КАП), аб чым гаворка будзе ісці далей.

**Выведка і контрвыведка**: дыслакуючыся на памежжы, КАП меў магчымасці для ажыццяўлення выведвальнай дзейнасці на іншым баку мяжы. З гэтай мэтай была створана выведвальная структура і база інфарматараў [11]. Апошняя часткова паўтарала базу інфарматараў паліцыі, што абумоўлена спецыфікай аховы мяжы да стварэння КАП.

Адзінкі выведвальнай службы стваралiся як пры асобных адзінках КАП, так і як асобныя адзінкі. Мэтай падобнай структуры было ажыццяўленне як выведвальнай дзейнасці, так і контрвыведвальнай дзейнасці. Гэта патрабавала функцыянавання выведвальнага апарату як на мяжы, так і ў памежнай зоне. У якасці памежнай зоны можа быць вылучана адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў межах якой дыслакаваліся адзінкі памежнай службы. Падобная структура дазваляла як аператыўна ўзаемадзейнічаць з адзінкамі КАП любога ўзроўню, што дазваляла штабам (заўв. маюцца на ўвазе штабы батальёнаў, палкоў і вышэй) аператыўна атрымліваць інфармацыю. Эфектыўнасць падобнай структуры пацвярджаецца

матэрыяламі справаводства КАП. Паводле іх, штабы батальёнаў і палкоў атрымлівалі інфармацыію аб перамяшчэннях вайсковых фармаванняў на савецкім баку мяжы і аб сітуацыі ў БССР [8]. Неапошнюю ролю грала і сетка інфарматараў на памежжы, якая ў сваю чаргу мела значнае падабенства з сеткай інфарматараў. Праз спецыфіку этнічную і палітычную рэгіёна, разгляд узаемадзеяння КАП з мясцовым насельніцтвам неабходна правесці асобна.

**Узаемадзеянне КАП з грамадскім насельніцтвам:** вышэйадзначанная спецыфіка патрабавала ад выведкі КАП маніторынга палітычнага становішча на памежжы. У моц аб'ектыўных абставін, атрымаць падобную інфрмацыю звонку немагчыма, што стала адной з прычын стварэння сеткі інфарматараў сярод прыхільнай часткі насельніцтва [8]. Неабходна адзначыць, што сетка інфарматараў КАП мела падабенства с сеткай інфарматараў паліцыі, што тлумачыцца як пераемнасцю (заўв. да 1924 г. частку функцый КАП і Стражы Гранічнай выконвала паліцыя) і запазычаннасцю падобнай практыкі ў межах Міністэрства ўнутранных спраў Польскай Рэспублікі, якому падпарадкоўвалася як паліцыя, так і КАП [5].

З мэтай пашырэння лаяльнасці і паляпшэння адносін паміж КАП і мясцовым насельніцтвам, ініцыяваліся культурныя імпрэзы з удзелам жаўнераў КАП і жыхарамі ваколіц [7]. Апошняе фіксуецца як у справаводстве КАП, так і ў перыядычным друку міжваеннай Польшчы [4]. Паляпшэнне адносін паміж КАП і мясцовым насельніцтвам спрыяла як паляпшэнню палітычнага становішча на памежжы і аблягчала маніторынг апошняга. Акрамя культурнай дзейнасці, фіксуецца дапамога КАПам мясцоваму насельніцтву і школьніцтву: "*Як у школу хадзілі, бяднейшым салдаты, як яны па-польску казалі жовнежы, памагалі, салдаты-жовнежы. Як я ужо хадзіла ў школу, ужо і карандашы давалі, ручку, як мы бяднейшыя былі, бяз бацькі, як нейкія гумовыя стэпці на зіму, нейкія як снігоўцы помню. Во гэдак памагалі. І так, бяднейшым нам, як гэдкія былі, варылі чай, во як ужо іду думаю, які смачны быў чай, цяпер гэдкага няма. І памазаны хлеб, нейкім жырам, ну распушчаны жыр, к чаю давалі.*" [1].

Ня гледзячы на актыўную дзейнасць у гэтым кірунку, пасняховасць спрэчная. Прычынай з'яўляецца палітычная сітуацыя на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводстваў, актыўная дзейнасць КПЗБ і іншых камуністычных арганізацый, якія апелявалі да больш важкаму, для вясковага насельніцтва, пытанню – эканмічнае становішча насельніцтва. Апошняе актуальна для жыхароў памежжа, якія ў выніку правядзення польска-савецкай мяжы ў 1920-х гг. страцілі частку зямлі з мэтай выключэння перамяшчэння мясцовага насельніцтва каля мяжы, акрамя насельных пунктаў, якія знаходзіліся на самой мяжы [2]. Добрыя стасункі з мясцовым насельніцтвам давалі магчымасць наймаць грамадскі персанал нізавых адзінак Корпуса аховы памежжа, што дазваляла вызваліць жаўнераў для ажыццяўлення асноўных задач [10].

Як вынік:

Інструментарый КАП дазваляў ажыццяўляць разнастайную дзейнасць. Эфектыўнасць правядзення культурных мерапрыемстваў, ня гледзячы на поспех, не ўплывала значна за смяненне стаўлення да КАП, што тлумачыцца як палітычным становішчам на тэрыторыі ўсяго ваяводства (заўв. Віленскага), эканамічным становішчам вясковага насельніцтва памежжа. Тым не менш, пазітыўны ўплыў на стаўленне да жаўнераў адзначаецца пры акцыях дапамогі насельніцтву, што фіксуецца ў матэрыялах вуснай гісторыі і справаводстве КАП.

Ня гледзячы на спрэчную эфектыўнасць у кірунку культурнай дзейнасці, Корпус аховы памежжа, на момант 1930-х гг., меў эфектыўную сетку інфарматараў на тэрыторыі памежных гмін, што дазваляла праводзіць як выведвальную дзейнасць, так і маніторынг палітычнага становішча, што ўплывала на прыярытэты пры вырашэнні задач.

Акрамя сеткі інфарматараў, Корпус аховы памежжа меў сваю выведвальную структуру, якая дзякуючы разгалінаванасці на ўсіх узроўнях КАП, забяспечвала штабы (заўв. ад батальёнаў, палкоў і вышэй) інфармацыяй як аб становішчы на польскім, так і савецкім баку мяжы. Пры гэтым, выведвальная дзейнасць не абмяжоўвалася выключна войскам і памежнымі адзінкамі СССР. У справаводстве Корпуса аховы памежжа фіксуецца палітычнае і эканамічнае становішча на савецім баку мяжы і (заўв. у залежнасці ад крыніц і дасягальнасці) БССР увогуле.

Эфектыўнасць КАП як вайсковай арганізацыі даволі спрэчная: у мірны час, разгрупаванне ўздоўж усёй мяжы пры наяўнасці рэзэрву пры батальёне, для падтрымкі пры прарыве ўзброеннай группай, паказала сваю эфектыўнасць, сведчаннем чаго з'яўляецца змяншэнне колькасці парушэнняў мяжы ўзброенымі групамі (бандамі, дыверсантамі), што паўплывала на тактыку КПЗБ з пачатку 1930-х гг. і гарантавала бяспеку ўсходняй мяжы краіны ў выпадку правакацый ці спроб узброеннага прарыву мяжы асобнымі групамі. Але, разгрупаванне, якое паказала сябе эфектыўна ў мірны час, у 1939 г. паказала сваю неэфектыўнасць пры шыракамаштабным наступе. Неабходна разумець што памежная служба не з'яўляецца стандартным вайсковым фармаваннем/структурай. Падбор кадраў і кандыдатаў на службу, спецыфіка падрыхтоўкі, мэт і задач Корпуса аховы памежжа з'яўлялась значна адрознай ад падрыхтоўкі іншых вайсковых адзінак. Адзінае, што было магчыма і прадугледжвалася ў выніку наступу – адыход і аб'яднанне ў буйнейшыя вайсковыя адзінкі ці аб'яднанне з сіламі Войска Польскага, якія былі сканцэн-

траваны на захадзе з сакавіка 1939 г., што выключала аб’яднанне адзінак КАП з Войскам Польскім у 1939 г. Вайсковы патэнцыял КАП мог бы быць рэалізаваны пры наяўнасці на тэрыторыі ваяводства буйных сухапутных сіл. Пры такім сцэнары, ад памежнай службы патрабавалася спыніць наступ праціўніка на кароткі тэрмін (заўв. кароткі праз аб’ектыўную магчымасць малых (колькасна) адзінак супрацьстаяць буйным вайсковым фармаванням) з мэтай выйграння часу для пачатку руха і дзейнасці асноўнага войска.

ЛІТАРАТУРА


1. Запісана ў 2022 г. Згірскім Ю.І. ад Гомен Надзежды Іванаўны 1927 г.н., у в. Гняздзілава, Докшыцкага р-н, Віцебскай вобласці.
2. Вилейский поветовый комитет по наделению землей при Вилейском поветовом земельном комиссариате (с 20.03.1922 - при Вилейском поветовом земельном управлении), г. Вилейка Вилейского повета Новогрудского воеводства, с 06.04.1922 - Виленского округа, с 22.12.1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.267. Оп.1. Д. 34.
3. Докшыцы (1939 – 1945) [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу. - https://det.doklibrary.by/index.php/ru/staronki-gistoryi. – Дата доступа: 28.09.2022.
4. Згірскі, Ю.І. Польска-савецкі кардон у межах Докшыцкай вясковай гміны ў міжваенным перыядычным друку Польшчы / Ю.І. Згірскі // Электронный сборник Трудов молодых специалистов Полоцкого государственного университета/ рэд.-склад. А.А Раманаў. – Наваполацк, 2021. – С. 22–26.
5. Полк "Вилейка" Корпуса пограничной охраны Министерства внутренних дел Польской Республики, г. Вилейка Вилейского повета Виленского округа (с 22.12 1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.5. Оп.1. Д. 7.
6. Полк "Вилейка" Корпуса пограничной охраны Министерства внутренних дел Польской Республики, г. Вилейка Вилейского повета Виленского округа (с 22.12 1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.5. Оп.1. Д. 36.
7. Полк "Вилейка" Корпуса пограничной охраны Министерства внутренних дел Польской Республики, г. Вилейка Вилейского повета Виленского округа (с 22.12 1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.5. Оп.1. Д. 38.
8. Полк "Вилейка" Корпуса пограничной охраны Министерства внутренних дел Польской Республики, г. Вилейка Вилейского повета Виленского округа (с 22.12 1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.5. Оп.1. Д. 61.
9. Поставское поветовое старосто Делегата правительства в г. Вильно (с 22.12.1925 - Виленского воеводского управления), г. Поставы Поставского повета Виленского округа (с 22.12.1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.2. Оп.1. Д. 223.
10. Полк "Вилейка" Корпуса пограничной охраны Министерства внутренних дел Польской Республики, г. Вилейка Вилейского повета Виленского округа (с 22.12 1925 - Виленского воеводства)// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.5. Оп.1. Д. 262
11. Prochwicz, J. Wywad Korpusu Ochrony Pogranicza 1924 – 1939 / J. Prochwicz // Wywad Korpusu Ochrony Pogranicza 1924 – 1939 – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: file:///D:/Knihi/2022/70.J.Prochwicz.pdf. – Дата доступа: 14.05.2022.